# Уступнае слова

Гісторыя дзяржаў, якія існавалі ў розныя перыяды на тэрыторыі сучаснай Беларусі, багата лёсавызначальнымі ваеннымі і дыпламатычнымі перамогамі, вялікімі здзяйсненнямі ў розных галінах культуры, навукі, унутраннай і знешняй палітыкі. Зразумела, что за гэтымі дасягненнямі былі людзі, якія тут нарадзіліся, або назаўсёды звязалі з ёй свой лёс, лічылі Беларусь сваей радзімай.

Вывучэнне ролі асобы ў гісторыі Беларусі наогул і ў дзяржаўна-прававой гісторыі, у прыватнасці, дазваляе значна пашырыць прадмет даследавання, зрабіць яго больш глыбокім і змястоўным, прывабным для сённяшняга пакалення беларусаў.

Гістарычная памяць заўсёды з’яўляецца істотнай крыніцай выхавання патрыятызму, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, гонару за сваю краіну, змагароў за волю і незалежнасць, выдатных мысліцеляў, палітыкаў, стваральнікаў навуковых, літаратурных, мастацкіх каштоўнасцяў, якія ўвайшлі ў скарбонку сусветнай культуры.

Мы стаім на той пазіцыі, што мінулае трэба ведаць дзеля будучыні, усведамлення свайго месца ў сусветнай чалавечай супольнасці, каб не проста “людзьмі звацца”, а быть роўнымі сярод іншых народаў. Ведаць гісторыю неабходна і для таго, каб вярнуць на Радзіму ўдзячную памяць аб суайчынніках, якія па розным прычынам, у тым ліку і не па свайму жаданню, апынуліся на чужбіне і прысвяцілі свой талент, усе сваі сілы іншым народам, іншым дзяржавам.

Наступіў час збіраць камяні, будавать уласную гісторыю, асабліва пасля абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Гэта справа не толькі сённяшняга, але і наступных пакаленняў суайчыннікаў.

На нашу думку, электронны зборнік матэрыялаў Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў юрыдычных і гістарычных факультэтаў ВНУ Беларусі “Роля асобы ў гісторыі дзяржавы і права Беларусі”, якая адбылася 3-4 лістапада 2016 года на факультэце права БДЭУ робіць значны крок у напрамку рэалізацыі вызначанай праблемы.

Аргкамітэт комплекса мерапрыемстваў І.У. Вішнеўская
“Дзяржава. Права. Асоба” І.П. Манкевіч